часу; перыяду стварэння стараславянскай мовы (другая палова IX ст.); перыяду напісання помнікаў, якія дайшлі да нас (канец X—XI стст.). На практычных занятках разглядаюцца элементарныя факты транскрыпцыі, роля складу ў гукавых зменах у сувязі з тэндэнцыямі да складовай гармоніі, узрастаючай гучнасці складу. Пры аналізе стараславянскіх тэкстаў увага звяртаецца на выніκі праславянскіх фанетычных тэндэнцый — да пераўтварэння колькасных галосных у якасныя, адкрытасці складу ў сістэме галосных гукаў, а таксама стараславянскія з'явы: моцную і слабую пазіцыі Ъ, Ь, характар Р і Л з Ь, Ъ, няпоўнагалоссе і інш.

У лекцыйным курсе марфалогіі (10 гадзін) разглядаюцца функцыі граматычных катэгорый назоўніка, займенніка, прыметніка, слоў з лікавым значэннем, дзеяслова. Высвятляюцца спосабы ўтварэння розных часцін мовы. Практычныя заняткі прысвечаны аналізу марфалагічных з'яў пісьмовых помнікаў, варыянтам сучаснага перакладу старажытных тэкстаў.

Пры аб'ёме курса ў 40 гадзін такія раздзелы, як лексіка і сінтаксіс, не атрымліваюць належнай увагі, яны разглядаюцца як невялікія фрагменты ўводзін і марфалогіі. Гэта значна звужае шляхі ўдасканалення вучэбнага курса ў адпаведнасці з патрабаваннямі адукацыйнага стандарта па спецыяльнасці.

**А.В.Жураў**, *дацэнт*

## ХАРАВОЕ ДЫРЫЖЫРАВАННЕ ЯК СРОДАК МУЗЫЧНАГА ВЫХАВАННЯ

Вядомы рускі кампазітар XIX ст. М.А. Рымскі-Корсакаў у сваім артыкуле "Эпідэмія дырыжорства", гаворачы аб умовах, неабходных для таго, каб стаць дырыжорам, адзначаў: "...Узброены ўменнем валодаць адным або двума музычнымі інструментамі, здольны, гэта значыць з прыродным сальфеджыо, пры веданні элементарнай тэорыі і наяўнасці

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

уяўлення аб гармоніі і інструментоўцы, вучань лёгка зробіцца дырыжорам або хормайстрам, калі авалодае... пэўнай кемлівасцю і пэўнымі... якасцямі" (Римский-Корсаков Н.А. Теория и практика и обязательная теория музыки в русской консерватории. — М., 1963. — С. 204).

Зусім не кожнаму выканаўцу або кампазітару ўдаецца зрабіцца добрым дырыжорам: для гэтага трэба мець не толькі шэраг ведаў і навыкаў, але і спецыфічны дырыжорскі талент. Безумоўна, дырыжор павінен быць выдатным музыкантам, мець добры музычны слых, адчуванне рытму, музычна-тэарэтычныя веды і, што немалаважна, быць высокаадукаваным і эрудзіраваным чалавекам. Калі для сталага музыканта галоўнай мэтай у час навучання дырыжыраванню з'яўляецца набыццё спецыяльнай тэхнікі, то для пачаткоўцаў дырыжыраванне ўяўляе сродак музычнага выхавання. Асноўны акцэнт на занятках па дырыжыраванні ў гэтым выпадку перамяшчаецца з набыцця тэхнічных навыкаў і ўменняў да развіцця агульнай музычнай падрыхтоўкі.

Адсюль вынікае: тэхніка дырыжыравання як выканаўчы працэс атрымлівае асноўную якасць толькі ў добра падрыхтаванага музыканта. Чым вышэйшы інтэлектуальны і музычны ўзровень таго, хто вучыцца дырыжыраванню, тым больш патрабаванняў выкладчык можа прад'явіць студэнту — раскрыццё высокіх мастацкіх мэт, дасягненне дасканалай тэхнікі.

Таленавітыя студэнты, якія пачынаюць вучыцца дырыжыраванню, патрабуюць увагі. Яна павінна быць накіравана ў першую чаргу на развіццё агульнай і музычнай культуры, выхаванне прымальных нормаў паводзін, а з дырыжорскага боку — на развіццё ўнутранага слыху, тэхнікі чытання нот, умення свабодна арыентавацца ў нотным тэксце.

Будучы спецыяліст-дырыжор — кіраўнік, выкладчык, выхавацель калектыву выканаўцаў. Гэтыя прафесіі даюцца толькі таму, хто ў музычных адносінах знаходзіцца вышэй за кожнага з членаў кіруемага ім калектыву.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Ніколі не трэба забываць, што прадмет вывучэння ў класе дырыжыравання ўяўляе музыка, што тэхніка дырыжыравання як адна з вонкавых формаў выяўлення выканаўчага працэсу не можа існаваць, тым больш вывучацца таму, што з'яўляецца толькі сродкам раскрыцця музычнага зместу, уздзеяння на выканаўцаў. Мастацкія задачы вызначаюцца матэрыялам — нотнай літаратурай розных зместу і ступені складанасці. Музычная літаратура не толькі вывучаецца шляхам аналізу, прайгравання ў думках і абмеркавання мастацкіх асаблівасцей твора, але і раскрываецца пры выкананні з дапамогай сродкаў тэхнікі дырыжыравання. У агульным вучэбным працэсе, які займаецца прафесійным выхаваннем музыканта, асобнае месца павінна адводзіцца індывідуальнаму выкананню, індывідуальным заняткам з выкладчыкам.

У фарміраванні музыканта гэта адна з неабходных умоў. У сувязі з гэтым дырыжыраванне мае шэраг пераваг над іншымі відамі музычнага выканання.

Па-першае, дырыжыраванне ў прасцейшай форме даступнае кожнаму таленавітаму музыканту, бо з'яўляецца выканаўчым сродкам выяўлення музычна-эмацыянальнага зместу твора, што не звязаны так цесна, як гэта назіраецца ў інструментальнай і вакальнай спецыяльнасцях, з працэсам гукастварэння. Канечне, і тут тэхнічнае забеспячэнне выканаўцы іграе немалую ролю. Але ў працэсе дырыжыравання навучэнцу лягчэй выявіць адчуванне музычнага вобраза, таму што яго дырыжорска-выканаўчы апарат больш свабодны. А гэта дае больш магчымасцей для выяўлення музычна-эмацыянальных перажыванняў.

Як паказвае педагагічная практыка, яркае ўяўленне вобраза выконваемага твора музыкантам станоўча адбіваецца на пераадоленні ім тэхнічных цяжкасцей.

Другой важнай перавагай дырыжыравання з'яўляецца тое, што прадметам вывучэння ў дырыжорскіх класах служыць вялікі па аб'ёме і змесце, выдатны па мастацкім узроўні музычна-харавы матэрыял кампазітараў



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Чайкоўскага, Глінкі, Даргамыжскага, Моцарта, Бетховена, Шумана, Багатырова, Алоўнікава, Семянякі, Кузняцова, Мдзівані і інш. Увесь шматфарбны свет музыкі аказвае станоўчы ўплыў на музычнае развіццё студэнта.

Немагчыма ацаніць багацце эмацыянальна-творчых перажыванняў, звязаных з выканаўчым аналізам, разборам і падрыхтоўкай кожнага харавога твора, для мастацкага росту навучэнца, развіцця яго музычнага і агульнага кругагляду.

Такім чынам, харавое дырыжыраванне, з'яўляючыся выканаўчай дысцыплінай, мае адначасова і больш шырокае значэнне як сродак музычнага выхавання.

**А.Р.Зязюля**, *дацэнт*

## СТАНДАРТЫЗАЦЫЯ Ў КАМП'ЮТЭРНАЙ ПАДРЫХТОЎЦЫ СТУДЭНТАЎ КУЛЬТУРАЛАГІЧНЫХ СПЕЦЫЯЛІЗАЦЫЙ

Асноўная мэта стандартызацыі ў вышэйшай адукацыі падпарадкавана агульнай мэце навучання — дасягненню высокай якасці падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў адпаведных спецыяльнасцей для азначанай галіны народнай гаспадаркі.

Стандартызацыя прадугледжвае нармалізацыю і уніфікацыю вучэбных планаў, праграм, метадаў і сродкаў навучання і кантролю. Эфектыўнасць стандартызацыі заключаецца ў распрацоўцы гібкіх нарматываў, якія б спрыялі павышэнню якасці арганізацыі навучальнага працэсу, забяспечвалі б грунтоўнае засваенне адпаведнага кола ведаў, выпрацоўку сістэмных падыходаў у падрыхтоўцы спецыялістаў.

Працэс стандартызацыі ў адукацыі прадугледжвае распрацоўку і ўкараненне уніфікаваных метадаў навучання, нармалізацыі складу асобных вучэбных дысцыплін, аптымізацыі вучэбных планаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ